Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Асуджаны да арышту Максім Вінярскі абвясціў сухую галадоўку

22.04.2014 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Максім Вінярскі

Суд Фрунзенскага раёна Менска вынес рашэнне Максіму Вінярскаму - 12 сутак арышту.

Актывісту, у якога вострая ангіна, у судзе стала дрэнна. Медыкі "хуткай дапамогі", якія прыехалі на выклік, сказалі, што яму неабходна гаспіталізацыя, аднак міліцыянты запрацівіліся - ён паедзе на Акрэсціна. У адказ на гэта Максім у судзе абвясціў сухую галадоўку.

***

У судзе Фрунзенскага раёна Менска разглядаецца адміністрацыйная справа актывіста кампаніі “Еўрапейская Беларусь” **Максіма Вінярскага**. Справу разглядае суддзя **Людміла Лапо**.

Сёння Маскіма Вінярскага, які выходзіў з гандлёвага цэнтра “Карона”, затрымалі супрацоўнікі міліцыі, паведаміўшы, што ён падобны на злачынцу.

У адзяленні міліцыі яго звінавацілі ў непадпарадкаванні супрацоўнікам міліцыі склалі пратакол за правапарушэнне.

Каардынатар «Еўрапейскай Беларусі» Максім Вінярскі, які нядаўна вызваліўся пасля 15-суткавага арышту з Цэнтру ізаляцыі правапарушальнікаў, паведаміў, што перад вызваленнем з ЦІПа супрацоўнік міліцыі прапанаваў яму часова з’ехаць са сталіцы. Маўляў, калі вы разумныя людзі, дык павінны

зразумець, што ў вас ёсць два варыянты: альбо з'ехаць з краіны, альбо выехаць у вёску на пэўны час (маецца на ўвазе час правядзення Чэмпіянату свету па хакею). Бо "пытанне з вамі ўсімі" будзе абавязкова вырашана, папярэдзіў супрацоўнік ЦІПа.

У адказ на гэтае папярэджанне Вінярскі заявіў праабаронцам, што ён не ўжывае наркотыкаў, не лаецца матам, не схільны да хуліганскіх учынкаў, і таму магчымы арышт просіць расцэньваць як прэвентыўную ізаляцыю з-за сваіх грамадска-палітычных перакананняў.

Твитнуть









"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023









## АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі трэмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

Дайджэст вызваленых: 12 палітвязняў у сакавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

"Могуць з'яўляцца злачынствамі супраць чалавечнасці". Што азначае гэтая фармулёўка ў дакладзе ААН пра Беларусь?

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

## Рэферэндум 2022







## Напрамкі дзейнасці

### ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

### СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY